Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

№ 20 (1078) Май 1989 г.

Год выдання 14-ы

Цана 2 кап.

СВЕДЧАННЕ ПРАГРЭСУ, КУЛЬТУРЫ, ДАБРАБЫТУ

На кніжнай выстаўцы ў павільёне ВДНГ БССР.

Фота Ул. КІТАСА.

«Книга есть мати всех речей и учитель всякому доброму умению... В сих притчах сокрыта мудрость, якобы моць в драгом камене, и яко злато в земле, и ядро у в ореху». Гэтымі словамі выдатнага беларускага асветніка і першадрукара Францыска Скарыны адкрываецца багатая кніжная экспазіцыя на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі БССР. На суд і агляд наведвальнікаў упершыню выстаўлена больш як паўтары тысячы экспанатаў — кніг, брашур, альбомаў, буклетаў, паштовак, твораў графікі.

З заміраннем глядзіш на тоўсты старажытны фаліянт з мудрагелістай славянскай вяззю. Колькі працы, часу і майстэрства было ўкладзена ў яго стварэнне. Такіх кніг было вельмі мала, і карысталіся імі адзінкі. Спагадлівую ўсмешку выклікаюць кніжкі, выдадзеныя на грубай паперы, занадта ўжо сціпла афармленыя. Яны нарадзіліся ў першыя гады існавання Савецкай улады, у рэспубліцы, дзе да Кастрычніцкай рэвалюцыі не было ніводнага выдавецтва. Сёння ў Беларусі дзевяць выдавецтваў. Штогод яны выпускаюць дзве тысячы назваў кніг агульным тыражом больш як 21 мільён экземпляраў. У 1913 годзе адна кніга прыходзілася на 32 чалавекі. У год кожны жыхар рэспублікі атрымлівае цяпер па шэсць кніг. Беларускія выданні ідуць у 70 зарубежных краін.

Гэтыя цікавыя звесткі можна прачытаць на спецыяльных планшэтах, гранях кубаў, дыяграмах, што размясціліся побач са шматлікімі стэндамі. На стэндах кнігі расстаўлены строга па тэматыцы. Гэта дае магчымасць прасачыць розныя этапы ў жыцці рэспублікі, паказаць не толькі прагрэс выдавецкай справы, але і вялікія поспехі, якіх дасягнуў наш народ за апошнія паўстагоддзя.

На першых стэндах — тамы твораў Маркса, Энгельса, Леніна на беларускай мове, кнігі, якія расказваюць аб жыцці і дзейнасці правадыра працоўных свету Ул. І. Леніна. Тут таксама творы пра барацьбу працоўных Беларусі за Савецкую ўладу, за стварэнне дзяржавы рабочых і сялян. Выданні, што з'явіліся ў апошнія 10—15 год, сведчаць аб нашых перамогах, аб тым, як расквітнела Беларусь у братняй сям'і народаў Савецкага Саюза. У серыі з шасці манаграфій «Вобласці нашай рэспублікі», у серыі з васьмі ілюстраваных брашур «Савецкая Беларусь», у маляўнічых альбомах пра Мінск, пра новабудоўлі, пра развіццё культуры і эканомікі прыводзяцца яскравыя лічбы і факты, якія расказваюць аб вялікіх перавагах савецкага ладу, савецкага спосабу жыцця.

«Беларусь гераічная, партызанская» — тут сабраны кнігі, прысвечаныя гераічнай барацьбе беларускага народа ў гады другой сусветнай вайны.

На спецыяльным стэндзе партрэты народных пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатаў Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР і БССР. Я. Колас, Я. Купала, К. Крапіва, К. Чорны, П. Броўка, М. Танк, М. Лынькоў — гэта гордасць беларускай літаратуры, яе заснавальнікі і стваральнікі. Іх творы ўвайшлі ў скарбонку савецкай літаратуры. Нядаўна выдавецтва «Беларусь» выпусціла дзевяць зборнікаў з рознакаляровымі вокладкамі, але з адзіным малюнкам афармлення. Гэта першыя кніжкі з серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі». Паэзія на выстаўцы прадстаўлена таксама творамі маладых — Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, В. Вярбы, Д. Бічэль-Загнетавай і іншых

Сабраны на выстаўцы пераклады на беларускую мову лепшых твораў сусветнай класікі, твораў літаратуры народаў Савецкага Саюза. Сталі даступнымі для беларускага чытача А. Пушкін, М. Горкі, Ш. Руставелі, К. Чандр, Д. Байран, А. Бальзак, В. Гюго, Ч. Дзікенс і многія іншыя. Для дзяцей перакладзены на беларускую мову японскія, афрыканскія, мангольскія казкі.

Дарэчы, дзіцячая літаратура прадстаўлена на выстаўцы вельмі шырока. Для самых маленькіх і дзяцей старэйшага ўзросту пішуць нашы старыя заслужаныя пісьменнікі А. Якімовіч, Ул. Дубоўка, П. Глебка, К. Буйла, Э. Агняцвет і маладыя, што не вельмі даўно прыйшлі ў літаратуру. Яны пішуць вершы і апавяданні, аповесці і казкі, якія разлічаны на розныя ўзросты, на розныя густы. Кнігі ніколі не залежваюцца на паліцах кнігарняў.

Дзесяць год назад ганаровым дыпломам на ўсесаюзнай выстаўцы была адзначана першая беларуская кніга. Цяпер кожны год нашы выданні атрымліваюць да дваццаці такіх дыпломаў. Выдавецкая справа зрабіла вялікі крок наперад, і нашы сённяшнія кнігі нельга і параўноўваць з тымі, што выйшлі 30—40 год назад.

У выпуску кожнай кніжкі прымаюць удзел аўтары, рэдактары, мастакі, паліграфісты. Увага звяртаецца і на змест, і на афармленне, і на паліграфічнае выкананне. У нас цяпер ёсць так званыя кнігі-лаўрэаты. Яны атрымалі прэміі на ўсесаюзных конкурсах.

Ёсць на выстаўцы стэнд, дзе змешчаны працы вучоных, падручнікі для студэнтаў і школьнікаў, творы музыкі і выяўленчага мастацтва. Адным словам, творы на любы густ, для самых розных мэтаў. Кніжная экспазіцыя на ВДНГ БССР — сведчанне прагрэсу, культуры, дабрабыту беларускага народа.

Паведамленне ТАСС

ВЫДАТНЫ КАСМІЧНЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ

Аўтаматычныя станцыі «Венера-5» і «Венера-6» дасягнулі планеты Венера

Савецкая навука дабілася новага поспеху. 17 мая 1969 года аўтаматычная міжпланетная станцыя «Венера-6» праз суткі пасля спуску станцыі «Венера-5» таксама завяршыла шматмесячны палёт па трасе Зямля — Венера.

Станцыя ўвайшла ў атмасферу планеты прыкладна за 300 кіламетраў ад месца ўваходу станцыі «Венера-5». Спускаемы апарат станцыі плаўна зніжаўся ў атмасферы на працягу 51 мінуты. У час спуску праводзіліся вымярэнні характарыстык атмасферы Венеры, якія перадаваліся ў цэнтр далёкай касмічнай сувязі.

Станцыя «Венера-6», як і «Венера-5», даставіла на планету вымпелы з барэльефам Уладзіміра Ільіча Леніна і адбіткам Дзяржаўнага герба Савецкага Саюза.

У Савецкім Саюзе паслядоўна і паспяхова ажыццяўляецца праграма вывучэння планеты Венера аўтаматычнымі касмічнымі апаратамі.

Упершыню ў свеце вывучэнне планеты Венера аўтаматычнымі касмічнымі апаратамі было пачата Савецкім Саюзам у 1961 годзе, калі да гэтай планеты стартавала станцыя «Венера-1». 27 лютага 1966 года савецкая аўтаматычная станцыя «Венера-2» праляцела паблізу планеты Венера, а 1 сакавіка таго ж года станцыя «Венера-3» упершыню дасягнула гэтай планеты, даставіўшы вымпел на яе паверхню. 18 кастрычніка 1967 года савецкая навука і тэхніка атрымалі новую выдатную перамогу. Упершыню ў гісторыі касмічных даследаванняў спускаемы апарат аўтаматычнай станцыі «Венера-4» зрабіў плаўнае зніжэнне ў атмасферы Венеры і вымераў яе параметры. Былі атрыманы унікальныя навуковыя звесткі аб фізічных характарыстыках атмасферы Венеры.

Аўтаматычныя станцыі «Венера-5» і «Венера-6» прадоўжылі вывучэнне гэтай планеты, узбагаціўшы навуку важнымі навуковымі данымі, і расшырылі нашы пазнанні аб Венеры, унеслі новы выдатны ўклад у навуку аб Сусвеце. У час палёту, які працягваўся больш як чатыры месяцы, аўтаматычныя станцыі «Венера-5» і «Венера-6» правялі важныя даследаванні фізічных працэсаў, якія адбываюцца ў міжпланетнай прасторы. Гэта дасягнута дзякуючы пастаяннай і паспяховай сувязі са станцыямі. З «Венерай-5» был праведзены 73, а са станцыяй «Венера-6» 63 сеансы радыёсувязі.

На працягу ўсяго палёту бартавыя сістэмы і навуковая апаратура станцый працавалі безадмоўна. Былі забяспечаны неабходны цеплавы рэжым у адсеках станцый, пастаянная арыентацыя іх сонечных батарэй на Сонца, а пры сеансах радыёсувязі — арыентацыя парабалічных востранакіраваных антэн на Зямлю. Усё гэта сведчыць аб высокім навуковым і тэхнічным узроўні аўтаматычных станцый.

Надзейная работа ўсіх бартавых сістэм станцый забяспечыла выкананне зададзенай праграмы іх палёту да Венеры і плаўнага зніжэння апаратаў у атмасферы планеты.

Спускаемыя апараты абедзвюх станцый зрабілі спуск у атмасферы планеты, як і было прадугледжана, на яе начным баку. Навуковая апаратура, якая знаходзіцца на борце апаратаў, у працэсе спуску вымярала хімічны састаў, ціск, шчыльнасць і тэмпературу атмасферы Венеры. Упершыню ў свеце навуковыя даследаванні атмасферы Венеры былі праведзены фактычна адначасова ў двух яе раёнах.

Стварэнне і палёт аўтаматычных станцый «Венера-5» і «Венера-6» ярка дэманструюць высокую дасканаласць савецкай касмічнай навукі і тэхнікі, талент вучоных, канструктараў, майстэрства інжынераў, тэхнікаў і рабочых. Новы выдатны поспех савецкай касманаўтыкі, дасягнуты напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна, — выдатнае сведчанне навукова-тэхнічнага прагрэсу Савецкай краіны, творчага энтузіязму яе народа, дастойны ўклад у асваенне касмічнай прасторы.

● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ



Мінскі камбінат будаўнічых матэрыялаў пашырае вытворчасць каляровай абліцовачнай пліткі. Калі сёлета прадпрыемства вырабіць яе 40 000 квадратных метраў, то ў будучым гэта лічба ўзрасце амаль у чатыры разы. Пачаўся мантаж першай аўтаматычнай электрапечы для абпальвання каляровай абліцовачнай керамічнай пліткі. НА ЗДЫМКУ: брыгадзір мантажнай брыгады Віктар БЕЛАЕД [злева] і мантажнік Віктар ШУМСКІ.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА.

СЕСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

Адбылася сесія агульнага сходу Акадэміі навук БССР. Яна абмеркавала арганізацыйнае пытанне.

Прэзідэнтам Акадэміі навук БССР выбран доктар фізіка-матэматычных навук, акадэмік Акадэміі навук БССР Мікалай Барысевіч.

Сакратар ЦК КПБ Ф. Сурганаў цёпла павіншаваў М. Барысевіча з выбраннем на высокую пасаду прэзідэнта Акадэміі навук БССР і пажадаў яму вялікіх поспехаў у рабоце па далейшаму развіццю навукі ў Савецкай Беларусі.

М. Барысевіч у сваім выступленні падзякаваў агульнаму сходу Акадэміі навук за аказанае яму давер'е і спыніўся на важнейшых задачах навуковых устаноў акадэміі.

Віцэ-прэзідэнтамі Акадэміі навук БССР выбраны акадэмікі АН БССР К. Гораў і М. Несцяровіч.

УНІВЕРСАЛЬНЫ РАЧНЫ БУКСІР

На стапелях Бабруйскага суднарамонтнага завода закончыўся выраб новага рачного буксіра-штурхача. Ён прызначаецца для ваджэння несамаходных барж і суднаў у вярхоўях Дняпра і яго мелкаводных прытоках.

— Буксір-штурхач выгадна адрозніваецца ад суднаў падобнага тыпу, — паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў тэхнічным аддзеле завода. — Ён лёгкакіруемы, у паўтара раза больш магутны за свайго сабрата, мае больш тоўстую бартавую і донную абшыўку, абсталёўваецца камфартабельнай каютай з радыёсувяззю, добраўпарадкаванымі душавымі і іншымі бытавымі памяшканнямі.

Нядаўна ўступіла ў строй першая чарга Магілёўскага камбіната сілікатных вырабаў. НА ЗДЫМКУ: мантаж вакуумных печаў у цэху сілікатных пліт.

Фота В. ДУБІНКІ.

У Гомелі завершана будаўніцтва пешаходнага моста праз Сож. Ён звязаў горад з левабярэжжам — месцам адпачынку гамяльчан.

Фота Ч. МЕЗІНА.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ

ЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ: СССР—55 ДЗЯРЖАЎ

У сувязях Савецкага Саюза з зарубежнымі краінамі важную ролю адыгрывае эканамічнае і тэхнічнае супрацоўніцтва. Яно ажыццяўляецца ў адпаведнасці з міжурадавымі пагадненнямі, заключанымі з 55 дзяржавамі.

Савецкія арганізацыі аказваюць садзейнічанне ў праектаванні і будаўніцтве прамысловых прадпрыемстваў і іншых аб'ектаў, пастаўляюць абсталяванне, машыны і матэрыялы, ажыццяўляюць геолагаразведачныя і пошукавыя работы, дапамагаюць рыхтаваць нацыянальныя кадры.

Эканамічныя адносіны СССР з іншымі дзяржавамі будуюцца на ленінскіх прынцыпах поўнага раўнапраўя бакоў, павазе нацыянальнага суверэнітэту і неўмяшання ва ўнутраныя справы, на ўзаемнай выгадзе.

Калі гаварыць аб сацыялістычных краінах, то тут трэба адзначыць, што наша супрацоўніцтва зыходзіць з неабходнасці найбольш поўна выкарыстоўваць перавагі міжнароднага сацыялістычнага падзелу працы, шырокую кааперацыю і спецыялізацыю вытворчасці. Кантакты носяць планавы характар і накіраваны на вырашэнне сумеснымі намаганнямі важнейшых народнагаспадарчых задач, якія стаяць як перад асобнымі краінамі, так і перад сацыялістычнай садружнасцю ў цэлым.

Да цяперашняга часу ў брацкіх краінах пры ўдзеле Савецкага Саюза пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю каля 1000 прамысловых прадпрыемстваў і іншых аб'ектаў, у тым ліку звыш 100 электрастанцый, больш як 30 прадпрыемстваў па здабычы вугалю, 20 металургічных заводаў і камбінатаў, 85 машынабудаўнічых і металаапрацоўчых прадпрыемстваў, нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы, сельскагаспадарчыя аб'екты і г. д.

За тавары, а таксама ў кампенсацыю затрат па эканамічнай і тэхнічнай дапамозе мы атрымліваем перш за ўсё машыны і абсталяванне. Паступаюць да нас і сыравінныя прамысловыя тавары. Венгерская Народная Рэспубліка дае, напрыклад, абсталяванне для кіслародных заводаў, заводаў арганічных фарбавальнікаў, кансервавых прадпрыемстваў, механізаваныя лініі па перапрацоўцы гародніны і бітай птушкі, іншае абсталяванне харчовай прамысловасці. З ГДР шлюць механізмы для заводаў штучнага і сінтэтычнага валакна, камплектнае абсталяванне цэментавых, цукровых і хімічных прадпрыемстваў. На многіх узорах абсталявання для серна-кіслотных заводаў, камплектнага абсталявання цукровых і заводаў па вытворчасці лёгкага бетону стаіць марка ПНР. За 20 гадоў Польшча экспартавала ў СССР 130 мільёнаў тон каменнага вугалю, 400 марскіх суднаў, 40 тысяч грузавых і 5 тысяч пасажырскіх вагонаў, 15 тысяч тон хімічнай апаратуры, 50 камплектных прамысловых прадпрыемстваў. Чэхаславакія пастаўляе камплектныя прадпрыемствы і ўстаноўкі хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці, абсталяванне для харчовай, тэкстыльнай і трыкатажнай прамысловасці, пракатнае абсталяванне, электравозы, рачныя дызель-электраходы і г. д.

У імпарце СССР з брацкіх краін значнае месца займаюць тавары шырокага ўжытку і харчовыя вырабы.

Паспяхова расшыраюцца эканамічныя сувязі з развіваючыміся краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. У іх з удзелам СССР пабудавана каля 300 прамысловых прадпрыемстваў і іншых аб'ектаў, якія маюць важнае значэнне для развіцця нацыянальнай эканомікі. Толькі гэтыя прадпрыемствы дазваляюць дадаткова выплаўляць 2,5 мільёна тон сталі ў год, выпускаць 2 мільёны тон пракату, здабываць 4,5 мільёна тон жалезнай руды, перапрацоўваць 7,5 мільёна тон нафты, вырабляць складанае металаапрацоўчае, горнашахтавае і энергетычнае абсталяванне. Сярод новабудоўляў ёсць таксама кансервавыя і цукровыя заводы, швейныя фабрыкі, электрастанцыі, машынна-пракатныя станцыі і сельскагаспадарчыя фермы.

Прынцыпы ўзаемавыгаднасці ў поўнай меры захоўваюцца таксама пры супрацоўніцтве Савецкага Саюза з краінамі, якія развіваюцца. Шырокі абмен дазваляе нам атрымліваць некаторыя важныя віды прамысловай сыравіны, расшыраць фонды і асартымент прадметаў ужытку і прадуктаў харчавання. СССР увозіць натуральны каўчук і шоўк, каляровыя металы і бавоўну, джут і джутавыя вырабы, воўну і скураную сыравіну, баваўняныя тканіны і скураны абутак. Мы атрымліваем таксама рыс, чай, какава-боб, лімоны, апельсіны, бананы, ананасы, вінаградныя віны. У 1967 годзе Савецкі Саюз, напрыклад, імпартаваў з краін, якія развіваюцца, каля 145 тысяч тон баваўнывалакна, прычым, каля 50 працэнтаў гэтай колькасці з ААР, 21 тысячу тон воўны, прыкладна 25 тысяч тон кавы, 82 тысячы тон какавабобу і 23 тысячы тон чаю, з якіх больш як 20 тысяч тон з Індыі.

Эканамічнае і тэхнічнае супрацоўніцтва Савецкага Саюза з іншымі дзяржавамі садзейнічае развіццю народнай гаспадаркі, росту палітычнага аўтарытэту нашай краіны. Яно садзейнічае ўзмацненню эканамічнай магутнасці сацыялістычнай садружнасці, умацаванню нацыянальнай эканомікі краін, якія развіваюцца, справе міру і прагрэсу.

Г. ВЕКШЫН,
намеснік начальніка Ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па знешніх эканамічных сувязях.

ШКОЛЫ МУЖНАСЦІ

Сіла духу, мужнасць савецкіх людзей, як ніколі раней, праявіліся ва ўсёй сваёй паўнаце і велічы ў гады другой сусветнай вайны. Прыкладаў таму — незлічонае мноства. Мы ж хочам спыніцца на адным з іх. Наш расказ — аб лясных партызанскіх школах.

Партызанскай зонай стала ў час вайны Бярозаўшчына. Тут, у Спораўскіх лясах і балотах, абаснаваўся штаб Брэсцкага партызанскага злучэння. У гэтых лясах выходзілі падпольныя газеты «Зара» і «Полымя».

Народныя мсціўцы выконвалі баявыя заданні: узрывалі чыгуначныя масты і пускалі пад адхон варожыя паязды, знішчалі нямецкія гарнізоны, неслі ў вёскі і на хутары словы вялікай праўды. А ў лесе жыццё ішло сваёй чаргой. Тут былі дзеці. І яны павінны былі вучыцца.

Аб тым, як узнікла ідэя стварэння лясной школы, расказвае Пётр Кавальскі— камандзір атрада і яе арганізатар.

— У чэрвені 1943 года ў нашу партызанскую зону прыляцелі самалёты з Вялікай зямлі і выкінулі на парашутах груз. Зброя і боепрыпасы былі загорнуты ў старыя газеты. Калі я іх праглядаў, мне ў рукі трапіла «Пионерская правда». Яна і з'явілася своеасаблівым штуршком да дзеяння. Я прачытаў аб тым, як у тыле клапоцяцца аб дзецях, і падумаў: «А хіба мы ў сябе ў атрадзе не зможам зрабіць для рэбят больш, чым робім?» У той жа дзень я адправіўся ў сямейны лагер. Тут і была арганізавана школа.

Адным з выкладчыкаў стаў Пётр Іваноўскі, які да вайны працаваў піянерважатым. У яго быў дрэнны зрок, і для баявых дзеянняў ён не быў прыгодны. Разам з Іваноўскім навучаннем дзяцей займаліся настаўніца Фаіна Карабецян, жонка камандзіра дыверсійнай групы Мікалая Карабецяна. Яна ў лясной чатырохкласнай партызанскай школе выкладала мову і арыфметыку, Пётр Іваноўскі — гісторыю і геаграфію. Нягледзячы на сістэматычныя бамбардзіроўкі немцамі сямейных лагераў і акаляючых вёсак, якія працягваліся з верасня па снежань 1943 года, дзеці рэгулярна наведвалі заняткі і выконвалі хатнія заданні. Першакласнікі вучыліся пісаць на пяску, а затым на бярозавай кары. Спачатку заняткі праходзілі пад адкрытым небам. Былі зроблены спецыяльныя лаўкі — адна ніжэй, другая — вышэй, якія нагадвалі парты. Тут дзеці сядзелі ў час урокаў. Калі над лесам з'яўляліся самалёты, рэбяты хаваліся пад елкамі. З наступленнем халадоў школа была пераведзена ў спецыяльныя зямлянкі.

Падручнікі ўсе знаходзіліся ў школе на стале. Побач стаяў будзільнік. Той, хто браў падручнік, адзначаў на паперы час. Праз устаноўлены прамежак перадаваў кнігу другому, затрымліваць у сябе не меў права. Дзякуючы гэтаму ўсе паспявалі вывучыць урок.

Камандаванне атрада было занепакоена праблемай падручнікаў і іншых пісьмовых прылад. Змяніўшы П. Кавальскага на пасту камандзіра атрада імя Калініна, Н. Ляпічаў, напрыклад, загадаў партызанам з баявых заданняў у зручных выпадках прыносіць алоўкі, паперу, кнігі.

У гэтай незвычайнай школе ставіліся ацэнкі і праводзіліся піянерскія зборы, тут урачыста адзначаліся рэвалюцыйныя святы і выдаваліся пасведчанні аб заканчэнні таго або іншага класа. З пасведчання, выдадзенага на імя вучаніцы трэцяга класа Лены Данілковіч, мы даведваемся, якія прадметы вывучалі рэбяты: мову, арыфметыку, гісторыю, геаграфію, прыродазнаўства, маляванне, спевы і фізкультуру. У графе «Адзнака аб пераводзе ў наступны клас» значыцца: «Пераведзена ў IV клас. 25/VI-44 г.» І подпісы камандзіра атрада Н. Ляпічава, камісара Ф. Бяляева, настаўнікаў Ф. Карабецян і П. Іваноўскага.

Усяго ў Бярозаўскім раёне было чатырнаццаць такіх школ. Умовы іх работы ў многім былі падобны.

Дзеці не толькі вучыліся пісьменнасці. Яны развучвалі песні, танцы, спартыўныя практыкаванні.

Цікавыя падрабязнасці паведамляе аб арганізацыі навучання ў лясной школе партызанскага атрада імя Чкалава Мікалай Карповіч. Тут для заняткаў была зроблена дошка. А пісаць на ёй не было чым. І вось рэбятам удалося адшукаць у зямлі крэйду. Але аказалася, што пісаць ёй немагчыма, крэйда разваль валася. Тады нехта з дарослых параіў намачыць крэйду ў малацэ і высушыць. Парада аказалася дзельнай. Крэйда пачала пісаць добра.

Не меншую знаходлівасць праявілі і пры пошуках паперы. Запасаў паперы не было. Тады сталі выкарыстоўваць газеты, паперу з-пад мяшкоў, старыя лістоўкі. Іх некалькі разоў вымачвалі ў вадзе, затым сушылі на сонцы. Літары выгаралі. Атрымлівалася нядрэнная папера. Але самай надзейнай «паперай» была бярозавая кара. Каб яна не высыхала і не скручвалася, яе захоўвалі ў гнілаватых пнях.

У якасці чарніла тут выкарыстоўвалі растворaную ў вадзе сажу, у якасці пер'яў— пер'е птушак.

...Савецкая Армія граміла ворага на тэрыторыі Беларусі, набліжалася да Бярозаўскага раёна. Усё актыўней абрушвалі на ворага ўдары народныя мсціўцы. Усе чакалі з нецярплівасцю светлага дня вызвалення. І гэты дзень прыйшоў.

Дзень 16 ліпеня 1944 года быў самым радасным. Усе лясы загрымелі ўрачыстымі залпамі—залпамі перамогі.

На другі дзень партызаны пакідалі лагеры.

З 1 верасня 1944 года для дзяцей партызан, як і для дзяцей усёй Савецкай краіны, адкрылі свае дзверы сапраўдныя школы—з дахам і вокнамі, з партамі і навучальнымі дапаможнікамі.

Настаўнікі і вучні лясных школ былі партызанамі і партызанкамі. Яны вучылі і вучыліся пісьменнасці і валоданню вінтоўкай, яны вучыліся любві да сваёй Радзімы і нянавісці да ворагаў.

Як склаўся іх лёс? Куды занеслі іх пасля вайны жыццёвыя шляхі-дарогі?

Арганізатар адной з першых лясных школ, былы камандзір партызанскага атрада імя Калініна Пётр Кавальскі—палкоўнік у адстаўцы, цяпер жыве ў Адэсе, працуе над кнігай успамінаў «Бура над Брэстам».

Фаіна Карабецян жыве і працуе ў горадзе Шахты Растоўскай вобласці.

Пётр Іваноўскі ў 1953 годзе скончыў Маскоўскую юрыдычную школу, а ў 1958 годзе — Усесаюзны юрыдычны завочны інстытут. Больш 15 год працуе ў калегіі адвакатаў горада Масквы. У студзені мінулага года ён сустракаўся з піянерамі і школьнікамі Міжлескай сярэдняй школы, расказваў ім аб лясных школах, аб барацьбе народных мсціўцаў з ненавіснымі захопнікамі.

Былы вучань, а затым баец партызанскага атрада Фёдар Труцько быў узнагароджаны медалем «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені. У 1944-ым яму было шаснаццаць. Ён прымаў удзел у аднаўленні разбуранага Мінска. У 1966 годзе Труцько завочна скончыў Мінскі індустрыяльны тэхнікум будматэрыялаў. Цяпер працуе майстрам на Нова-Бярозаўскім вапнавым заводзе.

Былая вучаніца лясной школы Лена Данілковіч звязала сваё жыццё з медыцынай і вось ужо многія гады працуе акушэркай Сакалоўскага фельчарска-акушэрскага пункта.

Былы інспектар лясных школ Ганна Калілец—работніца аддзела кадраў Брэсцкага аблвыканкома.

...Даўно адгрымелі залпы вайны. Абваліліся і зараслі травой партызанскія зямлянкі, сівізна абсыпала белым інеем галовы тых, хто ў пераможным годзе быў яшчэ зусім малады. Але народ не забывае сваіх герояў, тых, хто не дажыў да светлага і радаснага дня, хто склаў свае галовы ў малых баях і вялікіх бітвах. Таму не вянуць кветкі каля велічных помнікаў і сціплых абеліскаў, на якіх золатам гараць імёны загінуўшых.

Е. СЯЛЕНЯ.
Н. СІКОРЫН.

Канстанцыя БУЙЛА

Мы расцілі дзяцей...

Мы расцілі дзяцей не для новай вайны.
Мы хацелі, каб войн не спазналі яны.
Мы садзілі сады, засявалі палі,
Будавалі дамы, каб шчасліва раслі
Нашы дзеці, не знаючы гора вайны,
Мы адзелі зямлю у зялёны убор
Ад пясчаных пустынь да завоблачных гор.
Нашы дзеці — надзея бацькоў і дзядоў,
Хай агонь не кране іх юнацкіх гадоў,
Мы зрабілі, каб доля іх мірна цвіла,
Каб хапала ім хлеба, святла і цяпла,
Каб хапіла ім сонца і шчасця навек,
Каб не струшчыў ім долю благі чалавек.
Хай планета красой неўвядальнай цвіце.
Бараніце ад згубы дзяцей!



Тысячы турыстаў прыязджаюць да сцен Брэсцкай крэпасці, каб ушанаваць памяць тых, хто ў грозным 1941 годзе бараніў тут савецкую граніцу. Сярод нямногіх застаўшыхся ў жывых абаронцаў цытадэлі славы — Рыгор Макараў, цяпер жыхар Брэста. Атрымаць яго аўтограф—вялікі гонар для кожнага наведвальніка крэпасці. НА ЗДЫМКУ: Р. МАКАРАЎ дае аўтограф юнаму турысту з Мінска.

Фота А. ЛАРЫНА.

СЕГОДНЯ В НОМЕРЕ

ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ ЧИТАЕТ ПО-БЕЛОРУССКИ

В Минске, на ВДНХ БССР, развернута богатая книжная экспозиция. На суд и обозрение посетителей выставлено более полутора тысяч экспонатов — книг, брошюр, альбомов. Сегодня в Белоруссии девять издательств, которые ежегодно выпускают 2 тысячи названий книг общим тиражом более 21 миллиона экземпляров. В 1913 году одна книга приходилась на 32 человека, теперь каждый читатель республики получает в год по шесть книг («СВЕДЧАННЕ ПРАГРЭСУ, КУЛЬТУРЫ, ДАБРАБЫТУ», 1 стр.).

«ЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ: СССР — 55 ДЗЯРЖАЎ» (2 стр.) — это статья об экономических связях и техническом сотрудничестве СССР с зарубежными странами. Экономические отношения СССР с другими странами строятся на принципах полного равноправия сторон, уважения национального суверенитета и невмешательства во внутренние дела, на взаимной выгоде. При участии Советского Союза в братских странах построено и введено в эксплуатацию около 1 000 промышленных предприятий и других объектов. Мы получаем из этих стран машины и оборудование, товары широкого потребления, продукты питания.

Все дальше в прошлое уходят невероятно трудные годы Великой Отечественной войны. Давно стали взрослыми бывшие ученики лесных партизанских школ. Но никогда не забудут они своих первых учителей, уроки под открытым небом, прерываемые налетами немецких самолетов. И все же занятия проводились регулярно и ребята получали необходимые знания по всем предметам, предусматриваемым школьной программой мирного времени. О буднях партизанских школ Березовщины, о дальнейшей судьбе их учеников рассказывается в статье «ШКОЛЫ МУЖНАСЦІ» (3 стр.).

На 4 стр. под заголовком «ЛЕНІН — ДОБРА, ДОБРА...» мы печатаем путевые заметки Л. Прокши, который в составе группы советских журналистов проехал тысячи километров по ОАР и имел возможность наблюдать повседневную жизнь египтян. Побывали туристы и в Асуане — на этой всемирно известной «стройке дружбы». Теперь уже вступила в строй первая очередь Асуанской электростанции. С вводом в строй второй очереди страна получит не только дешевую электроэнергию, но и воду, которая оживит безжизненные пески теперешней пустыни.

В Праге недавно вышла книга, посвященная 150-летней истории чешско-украинских литературных связей. В богатом справочном материале, собранном чешскими учеными, есть сведения, интересные и для нас, белорусов, — о многосторонних белорусско-чешско-украинских взаимоотношениях, об интересе чешских исследователей к белорусскому и украинскому фольклору, о контактах наших литератур («ПРА ДРУЖБУ, ЯКОЙ 150 ГОД», 6 стр.).

Нататкі з падарожжа па Егіпце

«ЛЕНІН—ДОБРА, ДОБРА»...

У Асуан прыехалі ноччу. Мы з Максімам Паўлючэнкавым атрымалі пакой і хутчэй леглі спаць, бо наступны дзень меўся быць таксама напружаным.

Але мне не спалася. Хвалявалі дарожныя ўражанні. У вагоне, пакуль было светла, я не адыходзіў ад акна. На палях працавалі фелахі: убіралі кукурузу і бавоўну, аралі. Прылады, пры дапамозе якіх яны гэта рабілі, відаць, былі тыя ж, што і пры фараоне Рамзесе,—серп, матыка, драўляны сук або саха, якую цягнуў ішак, вол ці вярблюд. З завязанымі вачыма па кругу таптаўся запрэжаны ў прывод ішак. Круцілася драўлянае кола, то напаўняючы вадой з Ніла гліняныя збаны, то апаражняючы іх. Са збаноў вада па прымітыўных латках цякла ў раўчакі і на поле. Без гэтага жыццё б тут вымерла, як у пустыні, што жаўцее за ўрадлівымі палямі.

Але на той жа пустыні, якая вякамі пагражала фелаху засыпаць пяском яго ўрадлівыя нівы, узняліся магутныя металічныя фермы электраліній. Гэтыя гіганты, здаецца, гаварылі стомленаму працай пад афрыканскім пякучым небам фелаху:

— Пацярпі яшчэ крыху, гаротны чалавеча. Хутка ток з Асуана будзе падаваць ваду на твае нівы, а ў тваёй хаце заззяе электрычная лямпа, якую будаўнікі з Краіны Саветаў называюць лямпай Ільіча.

У студзені 1960 года па гэтай жа дарозе ў Асуан, па якой едзем мы, прыехалі савецкія будаўнікі: кваліфікаваныя рабочыя, інжынеры, геолагі. За імі эшалон за эшалонам рухалася магутная савецкая тэхніка. Над Нілам, сярод гранітных гор, за Асуанам пачалася вялікая будоўля.

Выбухі сярод гранітных скал абудзілі Нубійскую пустыню, якая раскінулася ад берагоў Ніла ў раёне Асуана да берагоў Чырвонага мора. З бедных нубійскіх і арабскіх вёсак на будоўлю прыйшлі жывёлаводы і былыя батракі феадалаў. Яны ўмелі запрэгчы ў драўляную саху вала, асядлаць ішака і вярблюда, але беларускі «Зубр» быў для іх вялікай загадкай. Савецкія рабочыя і інжынеры навучылі егіпцян кіраваць сучаснай тэхнікай.

У майскія памятныя дні 1964 года Ніл быў перакрыты. У той час на будоўлі працавала 30 тысяч чалавек, у тым ліку 1 850 савецкіх спецыялістаў.

Першая чарга будоўлі была закончана пры дапамозе 3 000 буйных савецкіх машын: экскаватараў, бульдозераў, аўтамашын, самазвалаў, пад'ёмных кранаў, буравых станкоў, самавыгружальных барж і помпаў. Зараз поўным ходам завяршаецца другая чарга будоўлі. У 1970 годзе Асуанская электрастанцыя поўнасцю ўвойдзе ў строй.

Высотная плаціна і станцыя — гэта не толькі ток. Гэта і вада, якая ажывіць і ўжо ажыўляе мільёны гектараў бясплоднай пустыні. Дзякуючы плаціне вышынёй у 111 метраў узнікла вадасховішча даўжынёй 500 кіламетраў і 10 кіламетраў шырынёй.

...Раніцой прабудзілі мяне гарластыя пеўні. Я не адразу ўцяміў, што знаходжуся ў Асуане, у адной з найлепшых сучасных гасцініц. Выйшаў на балкон. Метраў за 200 ад гасцініцы, над берагам Ніла, раскінулася вёска. Па вуліцы хадзілі куры, авечкі. З вышыні балкона можна было бачыць, што робіцца ў хатах жыхароў вёскі: шмат якія мазанкі не мелі даху. На зямлі, без ніякіх падсцілак спалі покатам дзеці, тут жа і жывёла, тут жа ў вялікім чыгуне на вогнішчы гатавалася страва.

Да калонкі час ад часу са збанамі, радзей з вёдрамі, падыходзілі жанчыны, захутаныя з галавы да пят у чорныя тканіны. Яны напаўнялі посуд вадой, ставілі збан на галаву і, не падтрымліваючы яго рукой, неслі ў хату. Калі насустрач ішлі суседкі, яны адказвалі на прывітанне або размаўлялі. Рабілі гэта так проста, быццам на галаве ў іх модная прычоска, а не цяжкі збан з вадой.

У час падарожжа па Егіпце мне часта даводзілася бачыць, як жанчыны пры сустрэчы з мужчынамі закрывалі твар.

— Чаму гэта так? — спытаў я аднойчы гіда. Гід растлумачыў з усмешкай:

— Каран дазваляе любавацца хараством жанчыны толькі яе мужу. Дарэчы, той жа каран дазваляе мужчыну мець чатыры жонкі.

У гарадах такія шматжонныя сем'і ўжо рэдкая з'ява. Ды і апранаюцца жанчыны ў гарадах больш па-еўрапейску.

Але вернемся да будоўлі. Нас чакае аўтобус. Шафёр-араб, ветліва ўсміхаючыся, запрашае па-руску:

— Давай, давай!

Адчуваецца, што хлопец працуе з нашымі рабочымі, але не зусім дакладна разумее сэнс гэтага слова.

У Каіры быў яшчэ больш смешны выпадак. Шафёр цэлы дзень вазіў нас па горадзе, а ўвечары на развітанне пакланіўся і, ветліва ўсміхнуўшыся, сказаў:

— Здравствуйте!

Аўтобус спыніўся на ўзгорку. Перад намі адкрылася цудоўная панарама высотнай плаціны: пенілася, падымала фантаны пырскаў скінутая з плаціны вада. Далёка, без канца і краю, сінела мора сярод бурай пустыні.

Пры ўездзе на будаўнічую пляцоўку мы ўбачылі вялікі плакат па-арабску і па-руску: «Три асуанских агрега-

Першыя кветкі — дзядулі Леніну.

Фотаэцюд А. ЛАРЫНА.

КНІГА ПАКІСТАНСКАГА ПІСЬМЕННІКА

«У краіне Леніна» — так называецца кніга, якая з'явілася на прылаўках кніжных магазінаў Карачы. Вядомы пакістанскі журналіст і пісьменнік Саід Бадшахад Алі дзеліцца ў ёй сваімі ўражаннямі аб паездцы ў Савецкі Саюз. Ён наведаў Маскву, Ленінград, Ташкент, гутарыў з рабочымі, вучонымі, дзеячамі культуры, азнаёміўся з жыццём савецкай вёскі. Аўтар з хваляваннем піша аб грандыёзных дасягненнях савецкага народа, які ідзе па шляху, указанаму Ільічом.

Кніга хутка раскупляецца пакістанскімі чытачамі, якія праяўляюць вялікую цікавасць да Савецкага Саюза.

Так живут молодые советские рабочие

ЧЕМ ВЫ ЗАНЯТЫ ПОСЛЕ ШЕСТИ?

На Пинскую трикотажную фабрику я пришел за час до конца рабочей смены. Как и на всяком другом предприятии, увидел знакомую картину: каждый был поглощен своим делом. Каждый выполнял какую-то одну небольшую операцию, а вместе это был огромный труд целого коллектива. Этим трудом сейчас жили все, потому что любили свою профессию, свою работу, потому что без фабрики, без товарищей не представляли себе своего бытия.

Но вот через час остановятся конвейеры, опустеют цехи, станет тесно у проходной. Одних ждут семейные заботы, других — приятный отдых, третьи, нетерпеливо посматривая на часы, ускорят шаг, чтобы не опоздать на занятия в школу. Коллектив как бы распадается, каждый уходит в свой мир — мир личных интересов. У большинства эти личные интересы совпадают с общественными.

Однако чем же заняты рабочие после трудового дня? Как проводят свой досуг? Что их интересует, кроме производства? С этими вопросами отправился я прямо на рабочие места. Но прежде, чем познакомить читателя с ответами, я немножко расскажу о коллективе Пинской трикотажной фабрики.

Это — среднее предприятие, каких немало в Белоруссии, занято здесь около тысячи человек. Так что жизнь этого коллектива, безусловно, характерна для многих подобных коллективов промышленных предприятий республики. Но есть две особенности, отличающие Пинскую трикотажную от многих других фабрик. Во-первых, здесь трудится только молодежь. Средний возраст рабочего не превышает, пожалуй, 20—22 лет. Во-вторых, на фабрике почти одни девушки. Мужское население составляет здесь незначительный процент. Правда, это еще ровным счетом ни о чем не говорит. Чтобы убедить в этом читателя, расскажу случай, который сам услыхал в заводоуправлении.

Как-то весной прошлого года на одном из общегородских совещаний, где были и представители таких крупных заводов Пинска, как судоремонтно-судостроительного, искусственных кож, фанеро-спичечного комбината, председатель фабричного профсоюза заявил, что на Пинской трикотажной создается своя футбольная команда. Зал долго не мог успокоиться. Все хохотали от души: это что же — в Пинске будет первая в Белоруссии женская футбольная команда?

Но осенью, когда футболисты трикотажной вышли победителями в финальных соревнованиях и заняли первое место в городе, тем, кто подтрунивал, было уже не до смеха.

Так что парни с Пинской трикотажной тоже кое-чего стоят. Но, бесспорно, славу коллективу приносят девушки. Они слывут не только умелыми мастерицами — краше невест на весь Пинск не сыщешь.

А теперь я предоставляю слово им самим. Что интересует их после шести часов вечера, когда заканчивается смена?

Нелли ВАСИНСКАЯ: «Я секретарь комсомольской организации швейного цеха. Поэтому после работы часто провожу собрания, молодежные вечера, встречи с людьми старшего поколения — участниками Октябрьской революции, соратниками В. И. Ленина, героями гражданской и Великой Отечественной войн, героями труда. Интерес к этому большой у всех, и, как правило, все мы в такие дни бываем вместе и после смены. Ну, а я сама готовлюсь поступить в технологический институт. При двенадцатой городской школе у нас организованы шестимесячные подготовительные курсы. Вот туда я и хожу почти каждый вечер».

Валентина БАГРИЦЕВИЧ: «Тоже готовлюсь поступить в институт. А кроме того два раза в неделю у меня тренировки по волейболу. Вообще увлекаюсь спортом. Вчера наша женская волейбольная команда заняла первое место в городских соревнованиях».

Марина ГЕРМАНОВИЧ: «Мне приходится делить свободное время на три части. На фабрике я выступаю как солистка эстрадного оркестра. В городском доме культуры у нас известный танцевальный ансамбль. Я участвую в нем. А все то время, которое остается после репетиций и выступлений в художественной самодеятельности, отдаю творчеству. Пишу очерки и статьи о жизни моих сверстников, обо всем новом на фабрике, пробую сочинять рассказы, новеллы. Публикуют меня в городской и областной газетах».

Людмила МАЦКЕВИЧ: «Я чуть постарше остальных работниц. Поэтому и заботы другие. Два года назад окончила техникум легкой промышленности. Работаю мастером швейного цеха. У меня уже есть сын. Самые приятные для меня часы, когда после смены я забираю его из детсада и мы отправляемся гулять по городу».

Хотя мужчин на фабрике мало, я решил все же встретиться и с ними, поинтересоваться, как они «ведут себя» за проходной. То, что услышал в ответ, не было удивительным для меня, но для читателя, думаю, представляет интерес.

Георгий КУЧИНСКИЙ, электрик: «Радиолюбитель я, а этим, видимо, все сказано. Если только не занят на фабрике, сижу дома и собираю радиоприемники. Уже семь приемников собрал. Недавно мы тут с хлопцами загорелись идеей создать свой эстрадный ансамбль. Так вот сейчас мастерю электрогитару. Купить, конечно, проще, но сделать самому — это же просто интересно. Еще люблю футбол и рыбалку».

Александр БУДЯКОВ, электрик: «Мое хобби — футбол. Играю полузащитником в своей команде. Значит, свободного времени мало. Но успеваю, кроме тренировок, посещать вечернюю школу. В этом году заканчиваю 10-й класс».

Я не собираюсь делать выводы из приведенного опроса, думаю, читатель сделает это сам. Хочу только отметить, что больше всего времени молодые рабочие тратят на учебу. Одни хотят завершить среднее образование, чтобы затем поступить в институт, другие уже учатся в институте или техникуме. Но цель у тех и у других одна — стать высококвалифицированными специалистами, мастерами своего дела. От этого зависит не только уровень материального обеспечения человека, но и его карьера. Фабрика для большинства стала родным домом, молодые девчата и парни связали свою жизнь с ней и хотят быть не просто рабочими, которые знают свой участок, свою операцию, а рабочими современными, с глубокими техническими знаниями, с весомым культурным и эстетическим багажом, с широким гражданским и политическим кругозором.

Из тысячи рабочих более двухсот учатся в вузах, техникумах, школах. Это — солидный процент. Естественно, что учатся все бесплатно, что администрация фабрики всячески поощряет учебу. Так личные интересы каждого совпадают с общественными интересами, да эти молодые люди никогда и не делят — это мое, а это фабричное.

На второе место после учебы можно поставить спорт. Это не удивительно — молодежь у нас везде увлекается спортом. И предприятия отпускают на развитие физкультуры и спорта огромные средства. К примеру, та же Пинская трикотажная. Фабрика пока не имеет своего стадиона, спортивных сооружений и вынуждена арендовать их у других предприятий. Молодым рабочим, как говорится, до этого и дела нет. Более того, они настаивают (и по праву настаивают), чтобы администрация и профсоюзный комитет начали строить свой дворец спорта. Но пока юноши и девушки тренируются на городском стадионе и в физкультурном зале Дворца культуры «40 лет Октября».

После шести пустеют заводские корпуса и становится более оживленно на улицах Пинска. Молодой рабочий народ спешит в школьные классы на занятия, во дворец культуры на репетиции, в спортивные залы на тренировки, в заводские клубы на встречи с мастерами искусств, с заслуженными гражданами республики. В этом потоке я вижу и Нелли Васинскую, и Валентину Багрицевич, и Марину Германович, и Александра Будякова, и сотни других их ровесников — молодых рабочих Пинской трикотажной фабрики.

В. КРАСЛАВСКИЙ.

та работают на благо египетского народа. Фирма Яшер Контрит». І другі плакат побач, падпісаны той жа фірмай: «Благодарим вас, строители, и да поможет вам бог в строительстве второй очереди».

Бог як бог, але людзі, узброеныя савецкай тэхнікай, натхнёныя дружбай, сапраўды робяць цуды. Нам, турыстам з Беларусі, было прыемна бачыць тут тэхніку з маркай нашых заводаў. Я спытаў аднаго шафёра-араба:

— Ну, як самазвал?

Ён узняў вялікі палец і сказаў:

— Рускі—добра, добра.

Дарэчы, у Каіры, Луксоры, Александрыі, на рынку ў арабскіх кварталах, на фабрыках віталі савецкіх турыстаў воклічамі: «Рускі — добра, добра». Чаму «добра»? Калі па-руску, дык «хорошо», дзівіліся мы, а потым даведаліся, што слова «добра» завезлі ў Егіпет яшчэ да будоўлі ў Асуане чэхі, якіх арабы лічылі за рускіх.

На будоўлі, якая раскінулася на 20 квадратных кіламетраў, не так лёгка сустрэцца і пагаварыць з кім бы хацелася. Ды гэта, бадай, і лепш. Кожны чалавек тут варты ўвагі і пашаны. Вось працуе нейкая брыгада. Падыходзім, вітаемся. І традыцыйнае ў такіх выпадках, калі не ведаеш, з чаго пачаць гутарку, пытанне:

— Ну, як?

— Нічога, — прыжмурваючы вока ў бок сонца, адказвае савецкі спецыяліст.— Да сарака пяці можна трываць. Калі вышэй—горш.

А сёння якраз 45 градусаў у ценю. Праз падэшвы адчуваеш, як прыпякае зямля.

Даведваемся: наш субяседнік—брыгадзір электрыкаў, інжынер Глеб Пятровіч Ануфрыеў.

— А гэта мой сябар Мухамед Абад, — прадстаўляе ён нам свайго арабскага памочніка. — Вучыўся ў Днепрапятроўску. Быў на практыцы ў Брацку. Добра працуе. Неўзабаве ўступаю яму сваё месца.

Савецкіх спецыялістаў на будоўлі становіцца ўсё менш. Вось так, як Глеб Пятровіч, яны рыхтуюць кадры і перадаюць штурвал кіравання. І ў гэтым самая галоўная рыса бескарыслівай дапамогі людзей, выхаваных у духу ленінскай інтэрнацыянальнай дружбы і братэрства.

Парусная лодка «Нубія», нахіляючыся то на адзін, то на другі бок, даволі хутка слізгае па паверхні Ніла.

Мы плывём на заходні бераг ракі агледзець гранітныя каменеломні.

Малады чалавек Ахмат кіруе ветразямі. Яму дапамагае чатырнаццацігадовы хлопчык.

— Абдул! — крыкне часам Ахмат, і хлопчык ужо ведае, якое месца заняць у лодцы.

Ахмат — нубіец. Назва лодкі «Нубія» — назва яго вёскі пад Асуанам. Яго памочнік Абдул — сын сястры. Ён скончыў абавязковую цяпер, пасля рэвалюцыі 1952 года, пачатковую школу і вось ужо зарабляе.

Нубійцы славяцца сваёй бездакорнай сумленнасцю. Калі нубіец знойдзе кашалёк з грашыма, то ён, хоць у яго кішэні няма і піястра, аддасць знаходку ў банк. Таму нубійцаў ахвотна прымаюць на працу ў магазіны, рэстараны, гасцініцы. Хай сабе рэч, пакінутая ў нумары, каштуе мільёны, нубіец на яе не пакваніцца.

Лодка Ахмату дасталася ў спадчыну ад бацькі. Дзесяць гадоў ён возіць на ёй турыстаў і курортнікаў. Асуан славіцца не толькі сваім гранітам і мармурам. Гэта вядомы ў свеце курорт. У студзені і лютым тут цёпла, але не горача, плюс 18—20 градусаў, і няма дажджоў. Праўда, у Ніле купаюцца толькі мясцовыя жыхары. У вадзе ёсць нейкія мікробы, якія пашкоджваюць печань іншаземца. У егіпцян, відаць, з вякамі выпрацаваўся імунітэт супраць гэтай хваробы. Наш гід нубіец Мухамед Таха зачарпнуў з ракі шклянку вады і выпіў. Але нам не раіў гэтага рабіць.

— Калі ў вас быў апошні дождж? — спытаў я.

— О, гэтага ніхто не памятае. Можа, гадоў 50 таму, а можа і тады не было.

Можна зразумець з гэтага, як важна для фелаха электрычнасць, пры дапамозе якой помпы гоняць ваду на палі.

Слова «асуан» азначае ружовы граніт. Сюды за гранітам на лодках прыязджалі егіпцяне з Мемфіса (Каіра) яшчэ ў тыя часы, калі фараоны будавалі піраміды і храмы. Гэта была тытанічная праца. Нявольнікі спачатку выбівалі ў граніце дзіркі, потым заганялі туды кліны з дрэва цвёрдай пароды і залівалі вадой. Кліны разбухалі і рвалі граніт. Адзін абеліск 20 метраў даўжыні, які выразалі яшчэ пры жыцці Хачэпсут для яе храма, застаўся ляжаць з тых часоў. Мы хадзілі па гэтай каменнай глыбе і дзівіліся, як пры той тэхніцы вырывалі са скалы, перавозілі і ўзводзілі такія аграмадзіны.

— За тысячагоддзі Ніл бачыў шмат цудаў: узнімаліся піраміды, велічныя статуі і абеліскі, будаваліся ўсыпальніцы фараонаў, але ўсё гэта рабілася дзеля таго, каб раскашавацца на тым свеце. Тое, што стварае сёння егіпецкі народ пры дапамозе Савецкай краіны, робіцца для шчаслівага жыцця на гэтай зямлі,—разважалі мы, вяртаючыся з каменеломняў у лодку.

Ахмат і Абдул чакалі. Яны прывіталі нас шчырымі ўсмешкамі, паднялі ветразі, і «Нубія» паплыла ў зваротны шлях.

Я зірнуў у зеленавата-жоўтую ваду Ніла і спытаў:

— Кракадзілы тут ёсць?

— Бываюць, але маленькія. Вышэй, дзе джунглі, там шмат кракадзілаў.

Мы плылі, любаваліся чароўнымі берагамі Ніла, каменным востравам, які сваёй формай нагадваў слана і таму меў назву Слановы.

— А ў вашай вёсцы,— спытаў я Ахмата, — ёсць ужо электрычнасць?

— Яшчэ пакуль няма, але будзе,—святло прыйдзе адтуль, — кіўнуў ён у бок Асуанскай плаціны.

На беразе, развітваючыся з лодачнікамі, мой сябар Максім падарыў нубійцу значок з партрэтам Леніна. Мы былі ўзрушаны яго хваляваннем. Ахмат прыклаў дарагі сувенір да скроні, потым да сэрца, потым стаў на калена і пацалаваў значок:

— Ленін — добра, добра.

Л. ПРОКША.

Гэты будынак упрыгожыў адну з галоўных магістралей Гродна — вуліцу Горкага. У ім размясцілася новая гасцініца «Беларусь». На сямі паверхах утульныя нумары, у якіх можа пражываць адначасова больш 300 гасцей.

Фота А. ПЕРАХОДА.

«ІЛ-62» ляціць у Сінгапур

У раскладзе Аэрафлоту 17 мая з'явілася новая міжнародная авіялінія Масква—Сінгапур. Траса будзе абслугоўвацца пасажырскімі лайнерамі «ІЛ-62». Увесь шлях будзе займаць менш 12 лётных гадзін.

Рэйс Масква—Сінгапур з'явіцца як бы працягам рэйса Масква—Лондан. Па часу ён вельмі зручны для пасажыраў, якія накіроўваюцца ў краіны Паўднёва-Усходняй Азіі. Практычна гэта самы кароткі і хуткі маршрут, які звязвае Еўропу з многімі азіяцкімі дзяржавамі. Сінгапур—51-я краіна, куды лятаюць самалёты Аэрафлоту.

Ю. ПАПОЎ.

ПАДАРУНАК ІНСТЫТУТУ ІМЯ ТАРЭЗА

Пасол СССР у Францыі В. Зорын перадаў інстытуту імя Марыса Тарэза ў Парыжы 909 дакументаў па гісторыі французскага і міжнароднага рабочага руху. Па даручэнню Міністэрства культуры СССР, Цэнтральнага музея рэвалюцыі, Дзяржаўнага гістарычнага музея і Інстытута марксізма-ленінізма ён уручыў гэтыя дакументы дырэктару інстытута імя Марыса Тарэза В. Жаанесу.

На ўрачыстай цырымоніі, якая адбылася з гэтага выпадку ў інстытуце імя Марыса Тарэза, прысутнічалі кіраўнікі Французскай Камуністычнай партыі, у тым ліку Генеральны сакратар ФКП Вальдэк Рашэ, а таксама многія вядомыя грамадскія дзеячы, ветэраны рабочага руху Францыі, прадстаўнікі навуковых колаў Парыжа.

Многія з перададзеных інстытуту імя Марыса Тарэза дакументаў датычаць жыцця і дзейнасці Ул. І. Леніна, які жыў у Парыжы з 1908 па 1912 год. Сярод іх знаходзяцца таксама пісьмы, якімі абменьваліся Карл Маркс і вядомы французскі сацыяліст Поль Лафарг, некаторыя архіўныя матэрыялы Парыжскай Камуны і іншыя дакументы.

З'ЕЗД БЕЛАРУСАЎ БЕЛАСТОЧЧЫНЫ

У Беластоку адбыўся 6-ы з'езд Беларускага культурна-асветнага таварыства, у якім прыняў удзел сакратар Беластоцкага ваяводскага камітэта ПАРП Вітальд Мікульскі. На з'ездзе былі падведзены вынікі трохгадовай дзейнасці і выбрана новае кіраўніцтва Таварыства. У прынятым рашэнні гаворыцца, што важнейшая задача ўсіх членаў таварыства — актыўна ўключыцца ў святкаванне 25-годдзя ПНР і ў выбарчую кампанію.

Беларускае культурна-асветнае таварыства існуе ў Польшчы 12 год і вядзе шырокую культурную і асветніцкую дзейнасць сярод пражываючай у Польшчы беларускай нацыянальнай меншасці. У Беластоку, дзе знаходзіцца галоўнае праўленне таварыства, выходзіць штотыднёвая газета «Ніва». Да сучаснага моманту выйшла ўжо больш 20 кніг на беларускай мове. У беластоцкіх вёсках існуе 68 беларускіх калектываў мастацкай самадзейнасці. Створана таксама эстрадная група «Лявоніха». У Белавежскай пушчы нядаўна быў адкрыты беларускі этнаграфічны музей. У гарадах Гайнаўка і Бельск-Падляскі працуюць сярэднія агульнаадукацыйныя школы, дзе выкладанне вядзецца на беларускай мове. Таварыства мае свае аддзяленні ў Варшаве і Гданьску.

ПРИГЛАШАЕТ «ЛЕСНАЯ СКАЗКА»

Прошлым летом в пионерском лагере «Лесная сказка» отдыхали дети наших земляков из Англии, Франции, ФРГ, Голландии и Финляндии. До сих пор приходят письма, в которых они вспоминают месяц, прожитый на родине матерей, советских ребят, с которыми успели подружиться.

Ждановичи — место, где расположена «Лесная сказка»,— очень живописное. Недаром здесь много пионерских лагерей, санаторий, дом отдыха, туристская база.

Этим летом «Лесная сказка» примет еще тридцать ребят — детей соотечественников из Англии, Бельгии и Западной Германии. Они прибудут в Брест 1 июля. Здесь их встретят сотрудники Белорусского товарищества по культурным связям с соотечественниками за рубежом, а после ознакомления с достопримечательностями Бреста, Брестской крепостью и крупнейшим заповедником Белоруссии — Беловежской пущей ребята автобусом поедут в Минск, а потом в «Лесную сказку».

За время своего отдыха дети соотечественников познакомятся с достопримечательностями Минска, побывают в музеях и театрах города, будут гостями кондитерской фабрики «Коммунарка» и одного из колхозов Минской области, они встретятся с белорусскими писателями, Героями Советского Союза, героями труда и познакомятся с жизнью советских ребят.

Словом, работники Белорусского товарищества, редакции газеты «Голас Радзімы», педагоги и вожатые пионерского лагеря сделают все для того, чтобы наши юные гости хорошо отдохнули и как можно больше узнали о родине матерей.

Дорогие ребята! Вас ждет «Лесная сказка». Мы надеемся, что вы привезете с собой песни и танцы вашей страны. Мы надеемся, что вы знаете русский язык и легко подружитесь с советскими пионерами.

П. ФРОЛОВ,
ответственный секретарь Белорусского товарищества по культурным связям с соотечественниками за рубежом.

ПИШУТ ЗЕМЛЯКИ ● ПИШУТ ЗЕМЛЯКИ ● ПИШУТ ЗЕМЛЯКИ

Большое спасибо за книги и особенно за брошюру «По обе стороны океана». Я ее прочел несколько раз, а также мы читали ее коллективно, и всем нам она очень и очень понравилась. Эта книжка, написанная правдиво и интересно, явилась для нас ценным подарком.

Сейчас мы готовимся к большому концерту, на котором будут гости из Торонто, Гамильтона, Санкатрино и др. Это будет как бы репетиция к Всерусскому канадскому фестивалю, который состоится 5 и 6 июля в Камсаке в годовщину 70-летия приезда первых русских переселенцев в Канаду.

Наши виндзорцы уже собираются в дорогу — на Родину. Они навестят родную и милую Беларусь, побывают в ее столице Минске, крепко пожмут руки дорогим друзьям и товарищам из Белорусского товарищества и редакции газеты «Голас Радзімы».

У нас, в Виндзоре, уже началась подготовка к 100-летию со дня рождения вождя и учителя трудящихся всего мира Владимира Ильича Ленина.

Большое спасибо за теплый отзыв о нашем женском хоре Григорию Романовичу Ширме и Петру Митрофановичу Фролову, который даже написал о нем в газету «Літаратура і мастацтва».

Канада. **М. МАКАРЕВИЧ.**

ПИШУТ ЗЕМЛЯКИ ● ПИШУТ ЗЕМЛЯКИ ● ПИШУТ ЗЕМЛЯКИ

ПРА ДРУЖБУ, ЯКОЙ 150 ГОД



У адрас нашай рэдакцыі прыйшла бандэроль з Прагі — Славянская бібліятэка прыслала для азнаямлення адно са сваіх апошніх выданняў: вялікі навукова-бібліяграфічны зборнік «Сто пяцьдзесят год чэшска-украінскіх сувязей». З удзячнасцю прымаючы падарунак чэшскіх сяброў, мы лічым, што з гэтай важнай і цікавай кнігай будзе карысна азнаёміцца і нашым чытачам.

На канверце адрас: Прага, Клеменцінум... І ў памяці паўстаюць велічныя, шэрыя ад пылу стагоддзяў муры гмаху, дзе, на самым верхнім, чацвёртым паверсе прымасцілася невялікая, але ўтульная чытальная зала Славянскай бібліятэкі. Там некалькі год назад я правёў мілыя для мяне часіны над стосамі кніг і часопісаў у пошуках нататак пра Беларусь, пра нашу мову, літаратуру, культуру. Маім пастаянным дарадчыкам быў тады навуковы супрацоўнік бібліятэкі доктар Міраслаў Зіма, надзвычай уважлівы, далікатны чалавек, гатовы ў кожную хвіліну дапамагчы парадай, указаннем на старадаўнюю, невядомую мне кнігу, новы артыкул. Тонкі знаўца нашай мовы (ён напісаў некалькі прац пра нашы моўныя сувязі, пра гісторыю Беларусі), Міраслаў гаварыў са мной па-беларуску, паказваючы ў сховішчы паліцы, дзе стаялі кнігі — нашы і пра нас. І пакуль я з захапленнем гартаў які-небудзь рэдкі часопіс, Міраслаў чытаў мне напаўголаса свой новы пераклад верша Міхася Скрыпкі або расказваў пра апошнюю знаходку унікальнай беларускай кнігі.

Памятаю, што ў чытальнай зале на палічках з надпісамі «беларуская мова», «украінская мова» часта не заставалася ніводнай кніжкі, ніводнага слоўніка. Потым я заўважаў гэтыя кнігі ў руках славіста з Венгрыі, Індыі, Федэратыўнай Германіі... Побач са мной за сталом аднойчы сядзеў малады афрыканец — ён вывучаў сувязі славянскіх народаў. Бо тут, у Славянскай бібліятэцы, сабраны кнігі на ўсіх славянскіх мовах і кнігі на мовах іншых, але прысвечаныя славянам.

Дырэктар бібліятэкі доктар Язэф Стрнадэл гаворыць: «Каштоўнасць і значнасць збораў амаль усіх аддзелаў стварае патрэбныя ўмовы, а ў нейкай ступені нават накладвае на Славянскую бібліятэку абавязак развіваць уласную выдавецкую дзейнасць, якая вырастала б з багатых матэрыялаў, якія маюцца ў бібліятэцы...»

Гэтыя словы мы цытуем ужо з кнігі, якая толькі што атрымана з Прагі, — зборніка «150 год чэшска-украінскіх літаратурных сувязей». Перад намі — ёмісты том амаль у паўтысячы старонак, плён шматгадовай працы вялікай групы супрацоўнікаў Славянскай бібліятэкі і Інстытута моў і літаратур Чэхаславацкай Акадэміі навук. Асноўную частку кнігі складае навуковая бібліяграфія — тут зазначаны звесткі пра 3 023 пераклады з украінскай на чэшскую мову, пра 4 316 прац і паведамленняў аб украінскай літаратуры і культуры, пра амаль тысячу архіўных матэрыялаў, якія датычаць Украіны і захоўваюцца ў чэшскіх навуковых установах. Якая велізарная праца зроблена!

Зборнік яскрава паказвае нам усё багацце і шматгранасць культурных сувязей паміж чэшскім і украінскім народамі, пераканаўча даводзіць іх заканамернасць і тэндэнцыі да пашырэння іх росту ў наш час.

Ад асобных перакладаў украінскіх народных песень у першых чэшскіх часопісах да выдання ў нашы часы шматлікіх кніг, анталогій, зборнікаў, даследчых прац, манаграфій, прысвечаных класічнай і сучаснай украінскай літаратуры, — вось шлях, які этап за этапам, ступень за ступенню разгортваецца перад чытачом зборніка. Цяпер, напэўна, няма ніводнага больш-менш значнага імя ва украінскай літаратуры, якое не было б вядома чэшскаму чытачу. А такім слаўным песнярам, як Тарас Шаўчэнка, Іван Франко, Леся Украінка, Максім Рыльскі, Мікола Бажан, Паўло Тычына, Алесь Ганчар, прысвечана ў братняй Чэхіі не адна кніга, не адно даследаванне!

Зборнік «Сто пяцьдзесят год чэшска-украінскіх сувязей» акажа неацанімую дапамогу славістам не толькі Украіны і Чэхаславакіі, але і іншых славянскіх краін. У тым велізарным даведачным матэрыяле, які сабралі аўтары кнігі, ёсць многа звестак, цікавых і важных і для нас.

Справа ў тым, што пры вывучэнні сувязей дзвюх блізкіх краін заўсёды неабходна прымаць пад увагу іх залежнасць ад кантактаў з другімі краінамі (асабліва, калі народы роднія па мове, паходжанню і г. д.). А ў беларуска-чэшскіх літаратурных адносінах немалаважную ролю адыгрывала культура Украіны, Расіі, Польшчы.

Возьмем, напрыклад, фальклор—нашы песні, казкі, — яны ж ідуць ад чалавека к чалавеку, з краю ў край. Колькі часам намаганняў трэба прыкласці, каб высветліць, чыя песня дзе бытуе — ці беларусы спяваюць украінскую, ці украінцы — нашу. Нават песня, пераклад якой на чэшскую мову ў 1814 годзе быў першым з украінскай мовы, — шырока вядома ў нас. Можа нават і вы яе помніце:

Ой, паслала мяне маці
Зеляное жыта жаці...
А я жыта не жала,
Ў баразёнцы ляжала...

І калі іменна такая песня, пашыраная ў дзвюх краінах, трапляе ў трэцюю, то мы, відаць, маем права гаварыць пра трохбаковыя сувязі. А яно так і было. Чэшскі вучоны Людвік Куба прыязджаў у канцы мінулага стагоддзя да нас, каб запісаць і украінскія, і беларускія песні. І вось да якога выводу ён прыйшоў: «У беларускай песні ...усё, што мы былі б схільны лічыць уплывам суседства, можа быць агульнай праславянскай маёмасцю як вынік агульнага славянскага паходжання... У этнаграфічным сэнсе Беларусь — асабліва добра захаваны славянскі край. Беларуская песня мае значна старэйшую музычную аснову, чым тая, якую мы знаходзім у заходніх славян». Некаторыя старадаўнія песні (напрыклад, валачобныя) вядомы толькі на Беларусі, на Украіне і ў Чэхіі.

У зборніку адзначаны працы пра нашага першадрукара і асветніка Францыска Скарыну — сапраўды, кнігі, выданыя ім у Празе, не толькі былі вядомы на Украіне, але і лічыліся там узорам выдавецкага мастацтва.

Адным з першых даследчыкаў творчасці Скарыны быў чэшскі вучоны Язэф Добраўскі. Прыехаўшы ў 1792 годзе ў Пецярбург, ён зацікавіўся «Пяцікніжжам» Скарыны і даказаў, што месцам выдання кнігі магла быць толькі Прага Чэшская. Добраўскі адзначаў, што «Біблія» Скарыны была пашырана не толькі ў Літве, Белай і Чырвонай Русі, але нават у Венгрыі.

І скарынінскія пераклады з чэшскай мовы былі не адзінкавымі на Украіне. Вядомы украінскі помнік XVII стагоддзя «Луцыдарый» з'яўляецца копіяй беларускага перакладу з чэшскай мовы.

А ў больш познія часы сувязі паміж Беларуссю, Украінай і Чэхіяй сталі яшчэ бліжэйшымі. Наш паэт Максім Багдановіч даў тонкі, глыбокі аналіз творчасці Тараса Шаўчэнкі і Васіля Самійленкі — адна з гэтых прац М. Багдановіча паслужыла чэшскаму вучонаму Яну Махалу крыніцай для характарыстыкі В. Самійленкі ў трохтомным даследаванні гісторыі славянскіх літаратур. А другую працу М. Багдановіча Я. Махал ведаў толькі па украінскім перакладзе, які выйшаў у Вене ў 1916 годзе.

Я ўважліва прагледзеў раздзел зборніка, дзе сабраны звесткі пра публікацыі, звязаныя з візітам савецкіх пісьменнікаў у Чэхаславакію ў 1935 годзе. І натыкнуўся на артыкулы, якіх раней не ведаў, напрыклад: «Уводзіны да перакладаў некаторых прац Івана Мікітэнкі і Янкі Купалы», «Руда зарж», 1935, стар. 239. А гэтых жа «Уводзін» няма і ў нашым музеі Купалы! Трэба шукаць.

У заключэнні кнігі складальнікі выказваюць спадзяванне, што яна будзе прыхільна прынята спецыялістамі і шырокімі коламі культурных працаўнікоў і адыграе станоўчую палітычную ролю.

У нашай прыхільнасці да такога роду выданняў не можа быць ніякага сумнення. Мы шчыра б віталі падобную кнігу, прысвечаную чэшска-беларускім літаратурным сувязям, традыцыі якіх ідуць яшчэ ад Францыска Скарыны.

А. МАЖЭЙКА.

МІНСК—ЛІЁН

Абмеркаван і падпісан план культурнага супрацоўніцтва паміж Беларускім аддзяленнем Таварыства «СССР —Францыя» і Ронскім дэпартаменцкім камітэтам Таварыства «Францыя — СССР». Ён прадугледжвае расшырэнне і ўмацаванне савецка-французскай дружбы. Бакі дагаварыліся аб тым, што будуць садзейнічаць абмену дэлегацыямі, турысцкімі групамі з мэтай узаемнага азнаямлення з гісторыяй, эканамічнымі здабыткамі, культурай, з жыццём беларускага і французскага народаў, устанаўлення асабістых кантактаў паміж рабочымі, служачымі, вучнёўскай моладдзю і іншымі прадстаўнікамі савецкай і французскай грамадскасці.

Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў працоўных выказаў гатоўнасць запрасіць дэлегацыю з горада Ліёна. Ронскаму дэпартаменцкаму аддзяленню Таварыства «Францыя — СССР» будуць накіроўвацца фотавыстаўкі, якія пакажуць розныя бакі жыцця беларускага народа, матэрыялы па гісторыі нашай рэспублікі, беларускія кнігі, альбомы, брашуры, лекцыйныя матэрыялы, музычныя творы беларускіх кампазітараў, дакументальныя і мастацкія фільмы.

У Беларусі і Ронскім дэпартаменце будуць узаемна адзначацца гадавіны нацыянальных свят, памятныя і юбілейныя даты, арганізоўвацца вечары дружбы, выступленні па радыё і тэлебачанню і ў друку, даклады на прадпрыемствах, ва ўстановах, паказы кінафільмаў. Нашы сябры ў Францыі адзначаць 52-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, 25-ю гадавіну вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў, стагоддзе з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

План культурнага супрацоўніцтва падпісалі старшыня праўлення Беларускага аддзялення Таварыства «СССР —Францыя» пісьменнік Іван Мележ і прэзідэнт Ронскага дэпартаменцкага савета Таварыства «Францыя — СССР» П'ер Вертэймер.

Творчы вечар у народным тэатры

Барысаўскаму народнаму драматычнаму тэатру споўнілася 10 год. Гэты творчы калектыў вядомы не толькі сярод барысаўчан. Яго спектаклі глядзелі працоўныя Мінска, Жодзіна, Маладзечна, Слуцка, Вільнюса і іншых гарадоў. У яго рэпертуары «Васа Жалязнова» М. Горкага, «Свеціць ды не грэе» А. Астроўскага, «Бацькаўшчына» К. Чорнага, «Глыбокая плынь» І. Шамякіна. Кіруе народным тэатрам заслужаны дзеяч культуры БССР Фёдар Міхайлаў. Пастаянны кансультант барысаўскіх артыстаў—народная артыстка рэспублікі Вольга Галіна.

З выпадку 10-годдзя народнага драматычнага тэатра ў доме культуры імя Горкага адбыўся творчы вечар. На ім былі паказаны сцэны з многіх спектакляў, пастаўленых у розны час.

П. БАРОДКА.



Зноў да мінчан прыехаў вядомы польскі ансамбль народнай песні і танца «Шлёнск». Гэты калектыў з вялікім поспехам выступіў у Палацы спорту, паказаў цікавую і разнастайную абноўленую праграму.

Гарняцкія песні і танцы, народны шлёнскі «Трояк», танцы «Куявяк» і «Абэрак», жартоўная песня «Дзядуля» і гратэскавая песенька «Разбойнікі» пакарылі пяцітысячную аўдыторыю. Мастацкі кіраўнік Станіслаў Хадына, харэограф Эльвіра Каміньска, харавы калектыў і танцавальная група зрабілі ўсё, каб данесці да гледача скарбы польскага фальклору.

Праграма «Шлёнска»—прыклад сапраўды мастацкай гармоніі, высокага артыстычнага густу і натхнення. Ансамбль яшчэ раз дэманструе невычарпальныя багацці народнай фантазіі, шчодрага гумару, сонечнай радасці.

Ул. КІТАС.

ВЧЕРА, СЕГОДНЯ И ЗАВТРА ГОРНОГО КРАЯ

Х. ГАДОЕВ,
депутат Верховного Совета Таджикской ССР.

Д. ЧЕРНЫШ,
заслуженный деятель культуры Таджикской ССР.

ПРОДОЛЖАЕМ ПЕЧАТАТЬ СТАТЬИ О ЖИЗНИ БРАТСКИХ СОВЕТСКИХ РЕСПУБЛИК, НАПИСАННЫЕ ДЛЯ НАШИХ ЧИТАТЕЛЕЙ ПО ПРОСЬБЕ РЕДАКЦИИ ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ».

Совсем недавно вышел в свет «Атлас Таджикской ССР». Объемистый том, содержащий десятки красочных карт и многочисленные справки. Таджикистан сегодня... Его природа, его народ, экономика и культура. Итоги почти полувекового развития некогда одной из самых отсталых окраин царской России, ставшей на путь великих социалистических преобразований.

Менее половины столетия в корне изменили облик горного края, — ныне одной из пятнадцати равных советских республик, образующих единое многонациональное Советское государство. При жизни менее чем одного поколения здесь произошли поистине исторические перемены.

Но вернемся к атласу. Каким рисует он нам сегодняшний Таджикистан — совсем небольшую по своей территории республику на юго-востоке страны? Вот несколько коротких справок: Таджикистан занимает 143 тысячи квадратных километров, примерно половина этой территории приходится на самую высокогорную область Советского Союза — Памир, лежащую на высоте 2—4 тысяч метров над уровнем моря. На сравнительно небольшой площади размещаются, правда, по вертикали, почти все известные климатические зоны — от арктической до сухих субтропиков. Девять десятых территории республики занимают горы и лишь одна десятая ее часть падает на плодородные долины. Население — около 3 миллионов человек.

Песни и сказания прошлого донесли до наших дней вековую мечту народа — найти «золотой кишлак», сделать общим достоянием великие богатства таджикской земли. И действительно, недра республики таят благородные и цветные металлы, уголь, нефть, природный газ, несметные запасы солей. Реки горного края по своим потенциальным энергетическим ресурсам выдвинули Таджикистан на второе после Российской Федерации место в СССР.

В долинах растут многие технические культуры и прежде всего хлопок. Значительные площади заняты садами, виноградниками, цитрусовыми.

И все эти богатства оставались почти нетронутыми в досоветское время. О жизни горцев в эпоху Бухарского эмирата можно судить по тому, что керосиновая лампа была в те времена роскошью.

Промышленное производство, представленное шестью полукустарными хлопкоочистительными заводами и мастерскими. Примитивное орошение, деревянный омач (соха) в сельском хозяйстве. Полпроцента грамотного населения. Два десятка учителей и врачей. Никакого профессионального искусства. Таким был Таджикистан 50 лет назад.

Нелегким был путь нового развития. Ведь начинать приходилось с нуля. Вплоть до начала тридцатых годов трудящиеся Таджикистана отражали вооруженный натиск басмаческих банд, щедро вооружаемых и вдохновляемых силами империализма из-за рубежа.

И тем не менее Таджикистан, ставший с 1929 года суверенной союзной республикой, быстрыми темпами развивал свою экономику и культуру. Бескорыстную помощь оказывали ему все советские республики. Проверкой прочности братских уз советских народов явилась Великая Отечественная война Советского Союза против немецко-фашистских захватчиков. Вклад в общую победу внесли и трудящиеся Таджикистана своим участием в сражениях на полях боев, своим трудом в тылу.

Что представляет собой Таджикистан сегодня? Это прежде всего более 90 отраслей промышленного производства, 300 крупных предприятий. Удельный вес тяжелой промышленности составляет одну четвертую часть в общем объеме промышленного производства. Речь идет о машиностроении и металлообработке, о непрерывно растущей добыче угля, нефти и природного газа, о многих горнорудных предприятиях, увеличивающих добычу цветных и благородных металлов, производстве ткацких автоматов, сельскохозяйственных машин, электрического кабеля и трансформаторных подстанций, азотных удобрений и многом другом.

Очень быстро развиваются в последние годы традиционные отрасли промышленности — легкая и пищевая. Таджикистан выпускает хлопчатобумажные и шелковые ткани (до 140 миллионов погонных метров в год), различные виды верхнего и бельевого трикотажа, около 25 миллионов пар чулочно-носочных изделий, более 100 миллионов банок фруктовых (главным образом, абрикосовых) консервов, свыше 62 тысяч тонн растительного масла.

По темпам промышленного производства Таджикистан опередил многие страны Европы, не говоря уже о восточных соседях. В совокупном общественном продукте на долю промышленности республики приходится 55 процентов.

Край, в который на первых порах завозились все промышленные изделия вплоть до гвоздей, теперь вывозит часть своей продукции в другие союзные республики и в зарубежные страны. Таджикистан поддерживает экономические связи с сорока государствами Азии, Африки и Европы. Республика вывозит ткацкие автоматы и запасные части к ним, точильно-шлифовальные станки, нефтяную арматуру, сельскохозяйственные машины, кабель для высоковольтных линий, хлопковое волокно, ткани, пищевые продукты. Мы поставляем товары в Англию, Францию, Японию, Голландию, страны Ближнего и Среднего Востока и многие другие государства.

И все же сегодняшний облик индустриального Таджикистана будет неполным, если мы не расскажем о совсем новых современных промышленных гигантах. Вот один из них — Яванский электрохимический комбинат. Он создается в осваиваемой сейчас одноименной долине. На ее целинных землях в прошлом году получен первый урожай хлопка. Горы, окружающие нетронутую веками долину, богаты запасами соли и известняков. Вместе с природным газом эти ископаемые явятся исходным материалом для выпуска 20 видов продукции «большой химии».

Об объеме и возможностях нового предприятия, которое выдаст свою первую продукцию в 1973 году, говорит такая цифра. С вводом в действие только первой очереди Яванского электрохимкомбината общий объем валовой продукции промышленности Таджикистана почти удвоится.

На развитие производительных сил Таджикской республики уже в скором времени окажут влияние и такие новостройки, как алюминиевый завод вблизи города Регара и Джижикрутский горнообогатительный комбинат, положившие начало новой отрасли народного хозяйства — цветной металлургии.

Вполне понятно, что промышленное развитие горного края потребовало создания достаточно широкой энергетической базы. И она теперь заняла достойное место в его экономике. В этом году будет произведено свыше трех миллиардов киловатт-часов электроэнергии. Это больше, чем имела ее вся царская Россия в 1913 году.

Осенью даст ток первый агрегат Яванской теплоэлектроцентрали, рассчитанной на мощность около полумиллиона киловатт. Крупная ТЭЦ действует и в столице республики — городе Душанбе. Однако главное направление энергетической промышленности — это гидроэнергетика. На севере республики более десяти лет работает Кайраккумская ГЭС. На реке Вахш на юге Таджикистана действует каскад гидростанций общей мощностью около 300 тысяч киловатт. В настоящее время полностью электрифицированы все города, поселки, все долины и абсолютное большинство высокогорных кишлаков.

Энергетика республики развивается бурными темпами. И ее завтра уже отчетливо вырисовывается в контурах уникальной Нурекской гидростанции на реке Вахш. Мощность ее определена в 2,7 миллиона киловатт, а выработка электроэнергии — в 10—12 миллиардов киловатт-часов. Неподалеку от Пулисангинского ущелья, где строится станция, возникнет грандиозное Нурекское море. Оно вместит более десяти миллиардов кубометров воды и позволит отрегулировать сток одной из великих среднеазиатских рек — Аму-Дарьи, оросить несколько миллионов гектаров земель в Таджикистане и в соседних республиках — Узбекистане и Туркменистане. В 1972 году первый агрегат Нурекской ГЭС даст самый дешевый в стране ток.

А тем временем изыскатели выбирают новый створ на той же реке Вахш для еще более мощного энергогиганта — Рагунской гидростанции (мощность 3,2 миллиона киловатт).

Огромные массы энергии Таджикистан сумеет подать в среднеазиатское энергетическое кольцо и употребить ее на развитие не только индустрии, но и своего очень многогранного сельского хозяйства, основанного в значительной степени на орошении.

Как и в промышленности, в сельском хозяйстве не приходится говорить о каких-либо весомых достижениях в прошлом. Можно упомянуть, например, что в дореволюционном 1913 году посевы хлопчатника занимали 26 тысяч гектаров, а в начале двадцатых годов они сократились до семисот гектаров. Кое-где в предгорьях сеяли хлеб, разводили скот.

Сегодня мы имеем дело с высокоразвитым механизированным сельскохозяйственным производством. Под хлопчатник освоены все земли так называемого «самотечного» орошения. И теперь уже вода с помощью электрических насосов поднимается «по ступенькам» все выше в горы. Ныне хлопчатник занимает в республике около 230 тысяч гектаров и дает очень высокие — до 40 центнеров с гектара — урожаи.

Благодаря семикилометровому ирригационному тоннелю в хребте Кара-Тау, подавшем вахшскую воду, стало возможным освоение уже упоминавшейся Яванской долины, где тонковолокнистый — самый ценный — хлопчатник займет еще более 40 тысяч гектаров. Одновременно такая же примерно площадь осваивается на землях так называемой Голодной степи на севере республики, строятся новые системы в Бешкентской и Аштской долинах.

Колхозы и совхозы имеют 16 с лишним тысяч тракторов, 1,3 тысячи зерновых комбайнов, 2 тысячи хлопкоуборочных машин, позволивших завершить механизацию основных трудоемких работ, прежде всего в хлопководстве, около 8,5 тысячи грузовых автомобилей.

Таджикистан производит, кроме хлопка и зерновых культур, табак, рис, лен-кудряш, развивает эфиромасличные и цитрусовые культуры. Десятки тысяч тонн ценной продукции дают сады и виноградники.

Не только в экономике, но и в науке и культуре Таджикистан проделал тот же путь — от отсталости к прогрессу. Современную его науку представляют национальная Академия наук с пятнадцатью научно-исследовательск и м и учреждениями. Диапазон их творческих изысканий — от проблем астрофизики до филологии. Научные исследования ведутся также в 56 институтах и лабораториях, подчиненных промышленным министерствам.

Высшие и средние специальные учебные заведения посещают более 60 тысяч студентов, а в общеобразовательных школах занимается свыше шестисот тысяч детей.

Примечательно, что половина всех рабочих и служащих специалистов народного хозяйства и культуры — женщины. И это там, где женщина была наиболее бесправным существом, опутанным страшными законами шариата. Раскрепощение женщины Востока, приобщение ее к государственной, политической, общественной и производственной деятельности — одно из величайших завоеваний Советской власти.

Трудящиеся Таджикистана имеют все условия не только для плодотворного труда, но и культурного досуга. В годы Советской власти родилось профессиональное театральное и кинематографическое искусство Таджикистана. Создана широкая сеть театров, кинотеатров, клубов, домов культуры. В библиотеках республики — более шести миллионов книг. В национальном издательстве выходят массовыми тиражами книги таджикских, русских и других советских и зарубежных писателей. Выпускается 85 периодических изданий.

Окидывая мысленным взором пройденный путь и оценивая свои исторические завоевания, таджикский народ справедливо связывает их с именем великого Ленина и огромной организаторской деятельностью созданной им Коммунистической партии.

На снимке: Душанбе, Привокзальная площадь.

спорт спорт спорт спорт спорт

У маляўнічым урочышчы пад Гродна, на беразе Нёмана, праходзіў традыцыйны мотакрос на прыз Героя Савецкага Саюза Д. Карбышава. У ім удзельнічала каля 200 спартсменаў з Беларусі, Украіны, Расійскай Федэрацыі і рэспублік Прыбалтыкі. НА ЗДЫМКУ: на дыстанцыі кроса.



●

Плаванне — адзін з самых папулярных відаў спорту на Віцебшчыне. Наш здымак зроблены ў віцебскім басейне «Маладосць», адным з буйнейшых у вобласці. У 76 групах асновамі плавання тут авалодваюць 1 140 дзяўчынак і хлопчыкаў.

●

У гонар 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Мінску праведзены чэмпіянат БССР 1969 года па шасэйна-кальцавой аўтагонцы. У ім прынялі ўдзел мацнейшыя гоншчыкі Беларусі, Масквы, Ленінграда і прыбалтыйскіх рэспублік на стандартных і гоначных аўтамабілях усіх класаў. НА ЗДЫМКУ: гоначныя машыны на старце.

*

Здымкі зроблены карэспандэнтамі Беларускага тэлеграфнага агенцтва І. ЗМІТРОВІЧАМ, А. ПЕРАХОДАМ, Г. УСЛАМАВЫМ.

*

ВЯСЕЛЬНАЕ ЎБРАННЕ ВЯСНЫ

Пераліваючыся жывым срэбрам, адплылі ў сінюю далячынь крыгі, скінулі ледзяную кальчугу рэкі і азёры. Па туманных лагчынах адшумела таропкая паводка, улілася ва ўлонне Бярэзіны, і воды ракі пайшлі, пабеглі ціхім ходам. Узнімаецца рунь азіміны, харашэюць травы.

Сонечнае святло, цяпло і вільгаць штодзень снуюць выдатную зялёную палатніну, абвіваюць узорным арнаментам запаведныя нетры. Над блакітнымі водамі, пад чыстай бірузой неба шаптун-вецер прыгладжвае мяккім грэбнем бярозавыя косы, кучаравіць вербы, агрэст, парэчкі, бэз, чаромху, рабіну. Уся зямля апранае вясельнае ўбранне, разатканае шоўкам і кветкамі-вяснянкамі.

На палянках, узмежках і лугах вы ўбачыце і пачуеце рост траў, заўважыце прылёт вяхіра, клінтуха. Ваш слых зловіць першы кліч бяздомнай зязюлі і трэлі іншых спевакоў. Нядаўна яшчэ цёмныя верхавіны асін, таполяў сёння ўспыхнулі, загарэліся, затрапяталі ў паветры смарагдавымі стужкамі.

Цэлыя суткі не сціхае шорах на майскіх пералесках. Шмат цікавага ў гэтыя дні ў прыродзе. Коўдра леташняга лісця з краю ў край прабіта зялёнымі пікамі муравы, якая знаходзіць сабе шлях да вясновай шчодрасці. У густых кустах, у ціхай глушы пушчы блукае хвалямі цёплае дыханне абуджанай зямлі. У прагалах паміж дрэў к поўнаму кубку блакітнага неба ўзнімаюцца вясновыя пахі зямлі. Зараз ім цесна ў лясных завулках і яны струменяцца дрыжачай дымкай над вежамі яловых астравоў, далёкім борам і прывольным лугам.

Квяцісты май запаланіў бела-ружовай пенай і сады. Задуменнымі маладухамі ў шлюбным вэлюме стаяць вішні, грушы, яблыні, слівы. А рабіна! Яе белыя парасоны з прыемным даўкім пахам не ўступяць самым вытанчаным вясеннім букетам. Кожная расліна, кожная кветка маюць свае сакрэты. Колькі відаў раслін, столькі і таямнічых гісторый. На вольны прасцяг выходзяць рамонкі, шчаўе, распускаюць букецікі чарнічна-бруснічныя плантацыі, ззяюць снежнай белізной сунічнікі.

Калі тонкая ружовая зара пасля цёплых майскіх ліўняў гасіць налітыя яснай спеласцю зоркі і ў малінавай акварэлі нябесных прастораў гуляе пышнае сузор'е святла, усюды наступае трапяткая цішыня.

Усё наваколле млее, дрэмле і выдзяляе ў празрыстае паветра надыходзячага світання мноства пахаў. Такой з'явай любавацца толькі на золаку—перад узыходам сонца. Крыштальныя кроплі расы, лісточкі свецяцца вясёлкавай чысцінёй. Усюды плыве вінны водар соку, маладой лістоты. У той момант, калі ўзыходзячае сонца сваімі агністымі промнямі расплавіць малюнкі ранішняй прыгажуні-зары, лясныя нетры агортваюць перапляценні святла і ценяў. Гуляюць зарніцы па імхах, дарогах і берагах вадаёмаў. На зямлі пачынаецца новы майскі дзень. У траве, абсыпанай расою, гараць блакітнымі плямамі незабудкі, усміхаецца светла-фіялетавая сон-трава. Сінюю люстраную пойму, якая на поўнена жоўтымі ліхтарыкамі расцвіўшай лотаці, досвіткам бузуюць нерастуючыя ляшчы, язі, акуні.

Вясна... На самых розных інструментах выконваюць радасныя вясеннія серанады птушкі. Бугай спявае ў вадзяную свісцёлку, апусціўшы доўгі нос у ваду. Жаўна дзюбай грукоча аб сухастоіну, і яна нацягнутай струной гучыць у сырым бары. Арнітолагі падлічылі, што берасцянка за майскі дзень спраўляецца «пакласці на ноты» 2 800 кароткіх песень, лясны канёк—на тысячу больш. Пра мачыўшы звонкае горла свежай расой, у хмызняках над вадой самцы пачынаюць гукавую дуэль. Спрэчкі свае яны вырашаюць спевам, змагаюцца песняй, кемлівасцю ды сілай голасу. Няспынна і на ўсе лады свішчуць гордыя салаўі. Свіст, перасвіст, шчабятанне, пошчак, пяшчотная грукатня, ціхія раскаты і іншыя выкрутасы чуеш у іх музычных пераборах. Жаваранкі, дразды, малінаўкі, гарыхвосткі, галубы спяваюць майскія сімфоніі сваім сяброўкам, якія занялі гнёзды з яйкамі для наседжвання. У фарсістым апярэнні, абвешаным самымі моднымі каралямі, бунтуюць воды качары-крыжанкі, лысухі, зімародкі. У вячэрнім небе снуюць кажаны, лялькі, згусткі начной цемры калашмацяць совы, пугачы. Раніцай дзённыя птушкі не пазнаюць дрэў, бо на іх гусцее і прыгажэе веснавое ўбранне.

Палепшылася жыццё і ў асяроддзі буйных жывёл. Папаўняюцца статкі ласёў, аленяў, казуль. Лепшым стаў харч вепрукоў, мядзведзяў. Растуць дзеці і ў астатніх чатырохногіх звяроў.

Процьма насякомых пакінула свае зімовыя сховішчы, засяліла лес, поле, луг і водныя глыбіні. Ад світання і да змяркання палявую даніну збіраюць руплівыя пчолы, чмялі.

Май! Твой светлы шлях усланы кветкамі-заранкамі, першым роспісам зыркіх маланак, цёплымі днямі, бальзамам зеляніны і галасістымі мелодыямі пералётных птушак.

Ул. БУТАРАЎ.

Бярэзінскі запаведнік.

У роднае гняздо вярнуўся белы бусел.

Фота А. ЛАРЫНА.

БУДУЧАЕ МІНСКАГА МОРА

Калі будавалі плаціну і напаўнялі чашу Заслаўскага вадасховішча, то, бадай, менш за ўсё думалі пра тое, што гэта месца стане зонай адпачынку гараджан. Тады на першым плане стаялі пытанні гаспадарчыя. Гораду не хапала вады. Маленькая Свіслач, разліваючыся вясной, затапляла вялікія масівы. а з наступленнем лета несла ўсю ваду ў Дняпроўскі басейн, ператвараючыся ў мелкі ручай. Між тым Мінск рос, узнікалі і расшыраліся фабрыкі і заводы. Вось тады і з'явілася думка стварыць штучны басейн.

Зусім побач з горадам, у пятнаццаці мінутах язды на электрычцы, разлілося «мора». У мінчан, не спешчаных воднымі прасторамі, яго наваколлі становяцца і ўлюбёным месцам адпачынку. Падлічана, што ў спякотны летні дзень сюды едзе да сямідзесяці тысяч чалавек.

Добраўпарадкаваннем Заслаўскага вадасховішча заняўся калектыў майстэрні генеральнага плана інстытута «Мінскпраект». Вялікую дапамогу яму аказала група ландшафтаведаў кафедры фізічнай геаграфіі Белдзяржуніверсітэта, якую ўзначальвае прафесар В. Дзяменцьеў. Вельмі важныя былі і вывады, зробленыя спецыялістамі-гігіеністамі санітарна-гігіенічнага інстытута і гарадской санітарна-эпідэміялагічнай станцыі, якія праводзілі даследаванні пад кіраўніцтвам доктара медыцынскіх навук П. Астапеня.

Слухаеш расказ В. Шыльнікоўскай, кіраўніка брыгады прыгараднай зоны «Мінскпраекта», і паступова вырысоўваецца цуда-цудоўнае: скрозь празрыстыя воды вадасховішча прасвечваецца чыстае пясчанае дно, знікаюць балоты, а на беразе вырастаюць сучасныя эручныя будынкі—гасцініцы, сталовыя, кафэ, пансіянаты, спартыўныя базы, стадыёны.

Зона адпачынку будзе мець плошчу 16,5 тысячы гектараў, што больш цяперашняй тэрыторыі Мінска. А размеры воднай паверхні дасягнуць амаль трох з палавінай тысяч гектараў. Па праектных даных сюды змогуць прыехаць адразу 170—180 тысяч чалавек.

Вялікую работу трэба правесці па расчыстцы дна і асушэнню балот. З сарака кіламетраў узбярэжжа цяпер эксплуатуюцца толькі тры, астатняе зусім непрыгоднае.

З уводам у строй Вілейскай сістэмы вырашыцца пытанне аб чыстаце вады. Калі цяпер ледзь-ледзь паспявае адбыцца адзін водаабмен у год, то тады ён стане пяціразовым.

Зона масавага актыўнага адпачынку будзе размешчана на ўсходнім, паўднёвым і заходнім узбярэжжах, дзе з'явяцца леса- і луга-паркі. Тут жа вырастуць галоўныя цэнтры культурна-бытавога абслугоўвання: магазіны, базы пракату інвентару, рэстараны, сталовыя, адкрытая летняя эстрада.

Уся паўночная частка застаецца спартсменам. Для іх пабудуюць розныя комплексы і базы. У раёне вёсак Загор'е і Ганалес плануюцца вяслярная станцыя, вяслярны канал і гідрапарк.

Яшчэ адзін буйнейшы спартыўны вузел будзе створаны на беразе Драздоўскага вадасховішча. Тут збіраюцца пабудаваць Цэнтральны стадыён рэспублікі, разнастайныя спартыўныя пляцоўкі.

Заслаўская зона масавага адпачынку магутным зялёным клінам, вузкі канец якога—парк Перамогі, будзе ўразацца ў тэрыторыю горада. Архітэктары не забыліся і аб дадатковых дарогах. Распрацаваны новыя прамыя магістралі, алеі для пешаходаў, дарожкі для веласіпедыстаў.

Цяпер рыхтуюцца рабочыя чарцяжы планіроўкі паўночнага берага, пачата ўзвядзенне водаагараджальных дамб у раёне Ратамкі.

А. ПАНАМАРОВА.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

НАШ АДРАС: МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 77.

ТЭЛЕФОНЫ: 6-19-31, 6-97-92, 6-18-88, 3-15-15.